

Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

ЧЭРВЕНЬ 2015 г. № 3 (53)

НАВІНЫ РЭГІЁНА

Более Br57 млрд. выделено на подготовку Круглого к областному празднику «Дожинки-2015».

В городском поселке Круглое продолжается подготовка к областному фестивалю-ярмарке тружеников села «Дожинки-2015». В центре населенного пункта ведутся работы по реконструкции и строительству. Главный подрядчик – «Круглянская ПМК-266».

Основным местом празднования «Дожинок-2015» станет площадь перед Круглянским районным домом культуры. Именно здесь в настоящий момент ведутся работы.

Также в планах капитально отремонтировать 11 жилых домов, заасфальтировать 7 улиц и установить металлические ограждения.


В 2013-2014 гг. КГК в 12 регионах Могилёвской области выявлены 42 дома, нормативные сроки строительства отдельных из которых были превышены более чем в 4 раза. В числе проблемных - 11 домов в Бобруйске, 8 – в Могилеве, по три - в Быховском и Мстиславском районах, два - в Краснопольском, по одному - в Белыничском, Глусском, Кировском, Кличевском, Осиповичском, Славгородском и Хотимском районах.

Выпускник 11 класса ГУО «Средняя школа №1 г.п.Белыничи имени Николая Ивановича Пашковского» **Иван Исаенко** стал лауреатам специальной премии Могилевского облисполкома.

Белыничский школьник в числе лучших пятидесяти представителей молодёжи Могилёвской области был награждён специальным дипломом и денежной премией.

КОШТЫ РАСТУЦЬ, А ДАХОДЫ Ў ЛЮДЗЕЙ НЕ ВЕЛЬМІ…

Галоўнае статыстычнае ўпраўленне Магілёўскай вобласці паведаміла, што агульны аб'ём грашовых даходаў насельніцтва ў першым квартале 2015 года склаў 11,6 трлн. рублёў і павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 9,7%. Пры гэтым спажывецкія цэны на тавары і паслугі ў параўнанні з леташнімі выраслі на 16,7%.



Атрымліваецца, што ў Магілёўскай вобласці цэны выраслі на 7% болей, чым павялічыліся даходы насельніцтва…

Зразумела, што тут нашы статыстыкі вялікай сенсацыі не зрабілі, бо амаль кожны жыхар нашага рэгіёна на ўласнай кішэні адчувае, што яго рэальныя даходы значна знізіліся. Зойдзеш у краму, здаецца, амаль нічога не купіў, а кашалёк ужо пусты…

Самае дрэннае, што гэта пакуль толькі яшчэ пачатак, а сапраўды цяжкія часы чакаюць нас наперадзе. Днямі міністэрства фінасаў Рэспублікі Беларусь паведаміла, што дзяржаўны доўг краіны на 1 траўня 2015 года склаў 236,6 трлн. рублей і павялічыўся з пачатку 2015 года на 39,1 трлн. рублёў, альбо на 19,8%. Прычым павялічыўся як знешні дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь, так і ўнутраны.

А яшчэ ж ёсць і даўгі разнастайных беларускіх прадпрыемстваў, якія ў нас, у асноўным, дзяржаўныя. І гэтыя даўгі таксама працягваюць расці. Па падліках вядома беларускага эканаміста Леаніда Заікі, на кожнага грамадзяніна Беларусі, ад немаўля да старога, ужо прыпадае амаль па 4000 долараў ЗША знешніх пазык.

А даўгі, як усім вядома, плаціць усё роўна трэба. Таму ўжо зараз можна канстатаваць, што ўзровень жыцця простых беларусаў будзе толькі зніжацца. Тым больш, што стан эканомікі Беларусі працягвае пагаршацца, многія прадпрыемствы пераходзяць на трох-чатырохдзённы працоўны тыдзень. Заробкі ў працоўных, як і пенсіі ў пенсіянераў, у рэальным вымярэнні не растуць ужо на працягу некалькіх месяцаў.

Шмат цікавага, паважаныя чытачы, чакае нас наперадзе пасля чарговых "выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі"…

Іван Барысаў

ОЧЕРЕДНОЙ ШКЛОВСКИЙ КОРРУПЦИОНЕР

Прокуратура Могилевской области возбудила уголовное дело в отношении бывшего заместителя директора одного из предприятий Шкловского района.

По словам правоохранителей, обвиняемый на протяжении двух лет давал указания на отпуск продукции предприятия в адрес одной из латвийских организаций, которая имела перед шкловскими компаньонами большую дебиторскую задолженность. И понятно, что с каждой отгрузкой размер этой задолженности только увеличивался. При этом зам.-директора отказывал другим предприятиям, которые желали приобрести продукцию на условиях 100% ее предоплаты. По словам заместителя начальника отдела по борьбе с коррупцией и организованной преступностью прокуратуры Могилевской области Дмитрий Молодида, действия подозреваемого привели к тяжким последствиям для предприятия. В частности, нанесен



ущерб в особо крупном размере – не менее 280 тысяч евро, так и не поступивших от латышской фирмы, которая сейчас не признает своих долговых обязательств. Санкция статьи Уголовного кодекса, по которой обвиняют бывшего руководителя предприятия, предусматривает наказание в виде лишения свободы сроком на 10 лет. Уголовное дело направлено в Следственный комитет, сообщает ТРК "Могилёв".

КРУГЛЯНСКИЕ УНИКУМЫ

Для кого размер не имеет значения, так это для жителей Круглого. Это один из самых маленьких и по территории, и по населению районов Беларуси. Но при этом район (ранее - з. р.) регулярно входил в число национальных лидеров по начисленным средним заработным платам.

В районе несколько серьезных работодателей. На территории Круглянщины располагается дочернее сельскохозяйственное предприятие «Беларусбанка» («Тетерино»), есть российский инвестор (кондитерская фабрика «Прайд-Юнион» и кабельное телевидение), потребкооперацию развивает не местное райпо, как практически везде, а «Могилевская межрайбаза». Крупнейшие бизнесмены района – это семейство Патрончиков. Николай Патрончик-старший, кавалер медали «За трудовые заслуги» и почетный гражданин Круглянского района, с 1995 года возглавляет самое крупное предприятие района - ГУК ДСП «Круглянское ПМК-266». Оно является структурной единицей «Могилевоблсельстроя». «Круглянское ПМК-266» оказывает не только строительные услуги, это крупнейший в районе собственник недвижимости, ему принадлежат несколько торговых и развлекательных центров, гостиница, ресторан, магазины, а также пасека, кондитерское производство, цеха по производству столярки, металлоконструкций, швейной продукции и мясопродуктов. Олег Патрончик-младший пошел по частной линии. Центральный офис его фирмы «ОлеПат» расположен в Минске, но он широко использует льготы, которые положены по государственной программе поддержки малых населенных пунктов при юридической регистрации там бизнеса. «ОлеПат» занимается торговлей на территории всей Беларуси кровельными и теплоизоляционными материалами, а сам бизнесмен признавался одним из лучших предпринимателей Круглянщины и Могилевщины.

Ej.by

ШКЛОВСКИЕ ПРОХОДИМЦЫ

Br42 млн. сняли с ранее похищенной банковской карты пенсионера 18-летняя жительница деревни Городец и 21-летний житель Шклова. Как рассказала официальный представитель УСК по Могилевской области Оксана Соленюк, деньги с карты снимались дважды.

Еще 19 мая 65-летний мужчина попросил девушку купить ему в магазине продуктов, для этого дал свою банковскую карту и сообщил пин-код. По дороге из магазина девушка решила посмотреть баланс, и была приятно удивлена имеющейся суммой. Она сняла Br4 млн. и забрала себе. Владелец карты пропажи денег не заметил. В следующий раз сельчанка отправилась в магазин с картой пенсионера вместе со знакомым. Тот мелочиться не стал и снял Br38 млн. – ему нужны были деньги для погашения кредита.

Карта была накопительная, и мужчина пенсию с нее не снимал, жил на проценты. Когда вновь поступившие проценты оказались слишком малы, обеспокоился и проверил баланс. Не увидев на карте денег, обратился в милицию. 1 июня Следственным комитетом в отношении молодых людей возбуждено уголовное дело по статье «Хищение путём использования компьютерной техники», сообщает mogilevnews.by.

БОРИС БУХЕЛЬ: ПУТЬ ИЗ КОНСТРУКТОРОВ В ПРАВОЗАЩИТНИКИ

Имя Бориса Бухеля в Могилеве хорошо известно - и общественным активистам, и силовикам. Половину жизни Бухель посвятил защите прав человека. О том, чего он добился, рассказывает DW.



Борис Бухель

Борис Бухель в 1997 году стал одним из учредителей Могилевского правозащитного центра (МПЦ), а теперь занимает пост председателя правления этой организации. Будучи инженером-конструктором по образованию, он и не предполагал, что будет защищать права человека.

Востребован, как никогда

Говоря о ситуации с правами человека в Беларуси, Борис Бухель отмечает, что общество пребывает в атмосфере страха. Бухель, по его признанию, был сильно удивлен, когда год назад к нему за помощью стали приходить люди с идеально написанными жалобами для подачи в суд.

В ходе разговора выяснилось, что обратиться к правозащитнику их надоумили адвокаты. Боясь потерять лицензию в процессе противостояния власти, адвокаты помогают людям оформить документы, но рекомендуют действовать через МПЦ. Таковы условия, в которых приходится работать, констатирует глава МПЦ.

Роль правозащитников в регионах сегодня тяжело переоценить, считает Борис Бухель. Начиная с 2011 года, указывает он, число граждан, недовольных белорусскими властями, в Могилеве резко увеличилось. Однако они не спешат вступать в оппозиционные партии или создавать общественные организации, а вместо этого идут за помощью к правозащитникам и журналистам.

У этого явления, по словам Бухеля, две причины. Во-первых, уголовные дела, возбужденные после подавления массовых протестов против фальсификации итогов президентских выборов 19 декабря 2010 года, привели к параличу оппозиционных политических организаций, который длится до сих пор. Во-вторых, в стране катастрофически не хватает правозащитников, готовых работать с полной самоотдачей: "Мы просто задыхаемся, сил не хватает даже для написания элементарных жалоб".

Две страсти

Борис Бухель родился 27 декабря 1954 года в Быхове на Могилевщине. По его воспоминаниям, это был маленький городок двух военных гарнизонов. В одном из них базировались военнослужащие танковых и ракетных частей Белорусского военного округа, а в другом - служившие на базе стратегических бомбардировщиков военно-морской авиации Балтийского флота.

Работы в Быхове для гражданских лиц не хватало. Поэтому когда Борис пошел в восьмой класс, его семья переехала в Могилев. Но с детства, признается Бухель, у него остались две страсти: военное дело и техника. Из-за плохого зрения будущий правозащитник был признан негодным к службе в армии. Тогда он попробовал попасть туда обманом - выучил наизусть таблицу для проверки остроты зрения и дважды был допущен окулистами к прыжкам с парашютом в аэроклубе. Однако на медкомиссии в военкомате более опытные врачи выявили подвох и устроили ему нагоняй.

Закалка Сибирью

Из-за плохого зрения Борис Бухель не смог учиться и в техникуме, куда поступил на картографическое отделение. После отчисления по состоянию здоровья он начаал работать в могилевском локомотивном депо, где за семь лет прошел путь от разнорабочего до слесаря четвертого разряда. Эта работа, признается Бухель, научила его дисциплине.

А в 1977 году он уехал в Сибирь строить железную дорогу Сургут-Нижневартовск, где проявились его способности к точным наукам. Борис Бухель внес рационализаторское предложение, которое позволило обеспечить транспортом тех, кто осваивал просторы Сибири. Дело в том, вспоминает Бухель, что венгерские автобусы "Икарус" не были предназначены для эксплуатации в условиях низких температур, постоянно выходя из строя. Тогда могилевчанин предложил ставить на них коробки передач от советских "Уралов". Эксперимент увенчался успехом.

Однако несмотря на все заслуги будущему правозащитнику решили не выплачивать положенное вознаграждение, и тогда он впервые понял: нужно разбираться в законах. Именно в Сибири Бухель узнал, какие функции выполняют прокурор, адвокат и судья, выучил советский Кодекс законов о труде.

Перестройка изменила все

В награду молодой рационализатор получил направление в вуз и уехал учиться на родину. Закончив Могилевский машиностроительный институт, он сразу же попал в конструкторское бюро Могилевского автозавода, где и начался его путь общественного активиста. На предприятии Бухель быстро стал одним из лидеров профсоюзной организации. Время пришлось как раз на горбачевускую перестройку, которая кардинально изменила жизнь совестких людей.

(Окончание на стр. 4)

БОРИС БУХЕЛЬ: ПУТЬ ИЗ КОНСТРУКТОРОВ В ПРАВОЗАЩИТНИКИ



Борис Бухель и Дмитрий Соловьёв

(Оконч. Начало на стр. 3)

А после распада СССР как грибы после дождя стали появляться различные независимые профсоюзы. Поначалу Борис Бухель относился к негосударственным структурам с опаской. Однако когда в 1992 году руководство официального профсоюза согласилось с остановкой предприятия без отплаты вынужденного отпуска рабочим, он сам возглавил ячейку "Свободного профсоюза".

Роковые годы

В 2000 году, вспоминает Бухель, в Беларуси начался процесс подавления независимого профсоюзного движения. Вначале возглавляемая им первичка "Свободного профсоюза" была лишена юридического адреса, а после и самого профсоюзного лидера вынудили покинуть предприятие. Тогда Бухель полностью сконцентрировался на работе МПЦ.

Бориса Бухеля прекрасно знают не только могилевские общественные активисты, но и местные силовики. Судьи, прокуроры, руководители УВД по стилю написания жалоб узнают их автора. И в большинстве случаев, говорит правозащитник, это помогает наладить с ними предметный диалог.

Исключением стал лишь день 3 июля 2011 года, когда во время так называемой молчаливой акции протеста в Могилеве Борис Бухель был задержан по прямому приказу одного из полковников и арестован на семь суток. "Я их поблагодарил за то, что исправили пробел в моей биографии: к тому времени отсидели уже все правозащитники", - иронизирует глава МПЦ.

В 2012 году Бухель был признан могилевскими демократическими силами "Человеком года" и с тех пор номинируется на это звание ежегодно. Коллеги, говоря о нем, отмечают его полную самоотдачу. Часто готовясь к судам правозащитник даже ночует в офисе. Сам он признается, что иначе жить уже не может.

Александр Бураков

Дураков хватает

27 мая Следственным комитетом возбуждено уголовное дело по ст. 339 ч. 2 УК (Хулиганство) в отношении троих жителей г. Шклова: 1997 г.р., двое – 1996 г.р., которые 17 мая в 00-30 в д. Говяды, из хулиганский побуждений сломали 11 пролетов заборного ограждения, принадлежащие Шкловскому УКП «Жилкомхоз», причинив ущерб на сумму 8 616 994 руб. Ущерб возмещён. Раскрыто СОГ, сообщает uvd.mogilev.by.

Загадчыца фірмовай крамы Магілёўскага мясакамбіната скрала мільярды рублёў

Жанчыну ўзялі пад варту.

Следчы камітэт пачаў крымінальную справу на загадчыцу фірмовай крамы ААТ "Магілёўскі мясакамбінат". Як паведамляецца на сайце СК, жанчыну падазраюць у крадзяжы грошай службовай асобай шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.

Паведамляецца, што загадчыца крамы разам з іншымі работнікамі мясакамбіната неаднаразова незаконна забірала з касы сваёй крамы выручку. Факты крадзяжы яна маскавала пад выглядам вяртання прадукцыі па розных падставах.

Сума шкоды высвятляецца, але, як кажуць следчыя, гаворка ідзе пра некалькі мільярдаў рублёў.

Загадчыцы крамы выставілі абвінавачанне і ўзялі пад варту. Следства мяркуе, што да злачынства спрычыніліся і іншыя асобы.

Магілу з жорнавам знайшлі ў Бялыніцкім раёне

На могілках ў Эсьмонах журналіст і краязнаязнаўца Андрэй Супіталёў звярнуў увагу на старую магілу, дзе надмагільны камень — каменны сялянскі жорнаў. Чыя гэта магіла — невядома. Драўляны крыж разбурыўся, на жорнаве няма надпісаў, але мяркуецца, што магіле болей за сотню гадоў.

Гэта — не эксклюзіў, але ўсё ж рэдкасць. Такія камяні знаходзілі ў Беларусі і ў Расіі. А ў Англіі, у Дорсеце жорнаў стаіць на магіле млынара, якія жыў 500 гадоў таму. Увогуле даследчыкі маюць розныя версіі наконт жорнаваў на магіле. Ёсць сярод іх і філасофская: каменнае кола можа азначаць кругазварот ўсяго ў свеце. Журналіст і краязнаязнаўца Андрэй Супіталёў мае намер стварыць каталог старажытных камянёў Бялыніччыны.

tvrmogilev.by

ДУРАКИ И ДОРОГИ

Когда белорусов обязали платить госпошлину за допуск автомобиля к движению, их клятвенно уверяли, что и без того хорошие белорусские дороги, станут еще более хороши. И вот прошло время... Кто-нибудь заметил позитивные изменения?

Помнится, глава государства строго настрого наказал, чтобы все перечисленные автовладельцами деньги шли исключительно на благоустройство дорог согласно государственной справедливости: 50% в республиканский бюджет, и 50% - в местный. Это чтобы дороги были хорошими не только в Минске, на республиканских и международных трассах, но также на небольших региональных дорогах.



Кстати, о справедливости. Ранее в Беларуси был так называемый транспортный налог, но потом его решили включить в цену автомобильного топлива. Опять же все по справедливости: чем больше ездишь, тем больше заправляешься и, соответственно, больше отчисляешь на содержание белорусских дорог. Именно так белорусские власти объясняли в свое время неожиданно подскочившие цены на бензин.

Этот вполне справедливый принцип просуществовал достаточно долгое время. И сегодня существует. Россияне, которые приезжали в Беларусь, удивлялись, какие у нас хорошие дороги - не хуже, чем в Европе. Завидовали нам и украинцы, и литовцы...

И вот, в 2013 году президент и правительство решили, что белорусские дороги не достаточно хороши, и нужны дополнительные средства, чтобы привести их в порядок. Белорусы шутки юмора не поняли: какие деньги, если все давно исправно отчисляют, покупая бензин? Пришлось опять неграмотному народу объяснять, что "бензиновых" отчислений мало, что нужно еще. Все сомнения относительно того, что средства пойдут совсем на другие нужды, были опять же развеяны главой государства: ни копейки на сторону!

Где деньги, Саша?

Помнится, во время выборов президента 2006 года кандидат на этот высокий пост Александр Козулин, спросил действующего главу государства: "Где деньги, Саша?". Этот вопрос просится и накануне выборов президента 2015 года.

С момента, как ввели госпошлину на допуск автомобиля к дорожному движению, прошло уже почти полтора года. Я настойчиво искал среди знакомых автовладельцев (и не только среди них) хоть одного человека, который бы заметил какие-то существенные изменения по обустройству белорусских дорог. Не нашел. По идее, денег белорусские дорожники должны были получать как минимум в два раза больше (в зависимости от того, сколько автовладельцев исправно платят госпошлину), соответственно, в два раза больше должно вестись дорожных работ. В первую очередь это касается именно тех дорог, которые требуют незамедлительного ремонта.

Ну да, постоянно ремонтируют МКАД, и другие стратегически важные дороги. Так их и раньше ремонтировали не меньше.

Единственный заметный объем работ, куда могли пойти собранные с автовладельцев средства, это строительство второй МКАД. Вот уж где действительно объемы...

По извините, правительство говорило, что вторая МКАД строится за счет кредита "Банка развития", а также средств фонда Национального развития. Выделение собранных с автовладельцев денег тоже обсуждалось, но в незначительном объеме и лишь из той части, которая шла в республиканский бюджет. А где все остальное?

Удивительно, но ни правительство, ни сам президент почему-то не объясняют, в каких объемах и куда были потрачены собранные с автовладельцев средства. Больше всего интересно было бы узнать про ту половину, которая распределилась в местные бюджеты, потому что там вообще не видно какого-либо активного движения по улучшению белорусских дорог. Это касается не только отдаленных от Минска территорий, но и близлежащих.

Вот едем по трассе М4, отъезжаем всего 15 км от Минска, сворачиваем с республиканской трассы на д.Заболотье, и вот вам, приехали. Тут только для танков полигон устраивать. Асфальтовое покрытие в таком удручающем состоянии, что машины по полю предпочитают его объезжать. Причем, если не успеть

(Окончание на стр. 6)

У АСІПОВІЦКІМ РАЁНЕ ЛЮДЗЯМ НЕ ВЫПЛОЧВАЮЦЬ ЗАРОБКІ І АДПРАЎЛЯЮЦЬ У ВЫМУШАНЫЯ АДПАЧЫНКІ

На пасяджэнні Асіповіцкага райвыканкама ў траўні ў шэрагу іншых пытанняў было разгледжана пытанне выплаты заработнай платы і сітуацыя на рынку працы ў раёне. Высветлілася, што сітуацыя па гэтых пытаннях у раёне проста катастрафічная – у першым квартале ў рэжыме няпоўнай занятасці ў Асіповіцкім раёне працавалі 3167 чалавек, альбо 18% ад спісачнай колькасці працоўных у раёне, з якіх 2919 знаходзіліся ў цалкадзённым (цалказменным) прастоі.

Як паведамляе інтэрнэт-сайт газеты “Асіповіцкі край”, “…за трыбуну з тлумачэннямі быў запрошаны і шэраг кіраўнікоў нашых буйных прадпрыемстваў — вагонабудаўнічага, аўтаагрэгатаў, шклозавода “Ялізава”. У красавіку працаўнікі УКДВП “Рамбуд”, напрыклад, своечасова не атрымалі зарплату, і кіраўнік ужо прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці, але напружанасць назіраецца не ў адным асобна ўзятым працоўным калектыве. У першым квартале ў рэжыме няпоўнай вымушанай занятасці на Асіповіччыне працавалі 3.167 чалавек — 18% ад спісачнай колькасці ў цэлым па раёне, з якіх 2.919 знаходзіліся ў цалкадзённым (цалказменным) прастоі. Сёння сітуацыя паціху паляпшаецца, але праблем па-ранейшаму хапае. Прычым, разам з памяншэннем колькасці занятага ў эканоміцы насельніцтва ў наяўнасці рост звярнуўшыхся за садзейнічаннем у працаўладкаванні ў службу занятасці. Па стане на 1 мая колькасць зарэгістраваных беспрацоўных склала 247 чалавек — на 175 больш, чым на пачатак года, заяўленыя вакансіі знізіліся са 195 да 76 і, як вынік, вырас каэфіцыент напружанасці”.

З прыведзеных лічбаў добра бачна, што бліжэйшым часам у колькасць “дармаедаў” у Асіповіцкім раёне значна павялічыцца, бо сітуацыя на мясцовым рынку працы толькі пагаршаецца. Нягледзечы на тое, што, як піша “Асіповіцкі край”, “За студзень-красавік у нас створана 224 новыя рабочыя месцы, і пошук найбольш аптымальных шляхоў выйсця з існуючай сітуацыі актыўна працягваецца”, мясцовыя жыхары скардзяцца на падзенне ўзроўню заробкаў, іх пастаянную затрымку і адсутнасць магчымасці знайсці хоць якую-небудзь годную працу ў раёне.



Не нашмат лепшая сітуацыя і ў нашым рэгіёне, дзе людзям таксама вельмі цяжка знайсці нейкую годную працу з прыстойным заробкам. Нават згодна дадзеных нашых мудрых статыстыкаў, у эканоміцы Магілёўскай вобласці ў красавіку 2015 года было занята на 1,1% менш людзей, чым у красавіку мінулага 2014 г. Колькасць афіцыйных беспрацоўных у вобласці ў красавіку 2015 г. у параўнанні красавіком 2014 г. павялічылася ў два разы і вырасла на 8,6% у параўнанні з сакавіком 2015 г. Між тым, ні для каго не з’яўляецца сакрэтам, што ў цэнтрах занятасці рэгіструецца значна меншая частка ад агульнай колькасці рэальных беспрацоўных, бо дапамога па беспрацоўю (калі яе яшчэ дадуць) проста мізэрная, а працоўныя месцы, якія там прапануюцца, вызначаюцца мінімальнымі заробкамі.

Людзі па-ранейшаму вымушаны масава з’язджаць у Расію і працаваць там на мясцовых капіталістаў, хоць і ў нашага ўсходняга суседа сітуацыя зараз далёка не мёд, стан спраў з выплатай і памерам заробкаў таксама значна пагоршыўся. Аднак беларускія ўлады, замест таго, каб гарантаваць працаўнікам своечасовую выплату заработнай платы і забяспечыць людзей працоўнымі месцамі з прыстойнымі заробкамі ў нашай краіне, больш занепакоены тым, каб пералічыць “дармаедаў”, якія самі забяспечваюць сябе і свае сем’і, і абкласці іх новымі падаткамі.

Барыс Вырвіч

ДУРАКИ И ДОРОГИ

(Оконч. Начало на стр. 5)

затормозить перед опасным участком, то можно сразу на кладбище угодить, которое как раз рядом. И такое вот творится в Минском районе!

Подобных участков дорог - стоит лишь съехать с республиканской трассы метров на 500 - в Беларуси очень много. За прошедшие 1,5 года они не стали лучше. Более того, они стали хуже, несмотря на огромный объем дополнительных средств.

Понятно, что за такое короткое время нельзя сразу все дороги отремонтировать. Но и не надо все. Покажите хоть что-то, где произошло значительное улучшение. Почему молчит Белавтодор, почему не расскажет, где закатали в асфальт деньги белорусов?

Я много езжу по стране на автомобиле, и почему-то не вижу никаких улучшений. Уверен, таких как я, подавляющее большинство. И если нам не объяснить, где деньги, мы будет чувствовать себя в очередной раз одураченными. С таким настроением и пойдем на выборы. И вопрос: “Где деньги, Саша?” опять станет лозунгом.

Сергей Сацук, Ej.by

Анекдот дня

– Вот, у меня сосед миллионер, а ездит на "девятке".

– Даже так. Скромный?

– Нет, я просто в Беларуси живу.

Ученые выяснили, чего хочет женщина. Но она уже передумала.

БЯЛЫНІЦКАЕ ГАБРЭЙСТВА: АД ЧАСОЎ ПРАКАВЕТНЫХ ДАСЁННЯ

Здавён часу на тэрыторыі бялынiччыны, як і па ўсёй нашай Беларусі, па-суседску мірна жылі-суіснавалі прадстаўнікі самых розных нацыянальнасцяў. Гістарычныя крыніцы, што захаваліся да сённяшняга дня, сведчаць аб адным: сур'ёзных канфліктаў на этнічнай глебе аніколі ў нас не было. Здаралася, канешне, паспрачаюцца сусед з суседам... Кулакамі памахаюць... Чаго не бывае ў жыцці? Але ж ці можна тыя спрэчкі-аплявухі параўнаць з крывавай разнёй, вайной?

У Бялынічах, іншых паселішчах па-суседску побач з беларусамі жылі габрэі, палякі, літоўцы, французы, харваты...

У слаўны час забытай зараз назусім беларусізацыі на бялынiччыне стварaліся нават нацыянальныя сельсаветы, установы. Прыкладам, польскія – Аляксандраўскі, Фелікс-Кананаўскі; дзеіў габрэйскі калгас "Новы шлях"... Ды тое сталася кароткай, як бліскавіца, гісторыяй.

У асобныя перыяды мінулай гісторыі іудзеі аказвалі даволі значны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае, культурнае развіццё не толькі Бялынічаў, дзе трывалыя пазіцыі займаў каталіцызм, але і старажытнага Галоўчына, Эсьмонаў. Напрыклад, развіццё школьнай справы на бялынiччыне першымі запачаткавалі менавіта габрэі. Захаваліся пісьмовыя сведчанні, звесткі гэтак званага другога падымнага тарыфу, якія сцвярджаюць, што ў 1703 годзе ў Бялынічах існавала толькі адна школка – габрэйская. На чале з Ізраэлем Моўшавічам. І ёй на правах уласнасці належыла ў мястэчку 11 дымоў. А першая навучальная ўстанова ў сельскай мясцовасці на тэрыторыі сучаснага Бялыніцкага раена для дзяцей, вядома, сялянскіх, праваслаўнага веравызнання ўзнікла ў Эсьмонах і толькі ў 1853 годзе. Ажно праз 150 гадочкаў!

Дакладны час пасялення габрэяў як непасрэдна ў саміх Бялынічах, гэтаксама і ў весках бялынiччыны, высветліць пакуль не ўдалося. Але наяўнасць у мястэчку школы адназначна сведчыць пра даволі-такі ранні іхні прыход. Вядома, што ў 1794 годзе Кацярына ІІ падпісала ўказ аб увядзенні мяжы габрэйскай аселасці на беларуска-літоўскіх, украінскіх землях.

Пачалося прымусовае ссяленне габрэйскіх сем'яў, у тым ліку і ў мястэчкі Бялынічы, Галоўчын, вёску Эсьмоны, якая неўзабаве таксама ўзвысіцца да статуса мястэчка. Разам з гэтым, пераселеным габрэям строга забаранялася трымаць корчмы ў вёсках, арэндаваць панскія землі. Іншымі словамі, яны ў прымусовым парадку павінны былі павялічыць шэрагі месцічаў – жыхароў мястэчак.

Гэты указ, нягледзячы на яго зневажальны, несправядлівы характар, антычалавечую сутнасць, трэба шчыра сказаць, прыдаў значны штуршок працэсу развіцця названых мястэчак. Па-першае, яны, дзякуючы прыроднай схільнасці новых насельнікаў, станавіліся гандлёвымі цэнтрамі, пачала актыўна развівацца і складвацца дробная, кустарная прамысловасць самых разнастайных накірункаў. Па-другое, павялічылася і сама колькасць жыхароў гэтых паселішчаў.

Прысочым дынаміку росту/змяншэння колькасці жыхароў Бялынічаў і Галоўчына на працягу 112 гадоў – у перыяд з 1785 да 1897 гадоў. Паводле звестак за 1785 год, у Бялынічах, якія належалі князю Францішку Ксаверыю Агінскаму, налічвалася 831 жыхароў, а ў Галоўчыне, уладальнікам якога з'яўляўся Міхал Пац, мелі сталае жыхарства 891 чалавекі. Пры гэтым, і па колькасці двароў Галоўчын пераўзыходзіў Бялынічы – у першым мястэчку іх было 116, у другім – 108. Праўда, інфармацыю аб этнічным складзе насельнікаў гэтых двух мястэчак, на жаль, пакуль адшукаць не ўдалося.

Статыстычныя звесткі па стану на 1860 год яскрава адлюстроўваюць ужо і канфесійны склад



насельніцтва. У Бялынічах тады жыло 1100 (па іншых звестках, толькі па стану на 1861 год, – 1945). Прырост за 75 гадоў склаў 269 асобаў. З агульнай колькасці бялыніцкага жыхарства, за найбольш верагодныя бярэм звесткі на 1860 год, 407 (37 працэнтаў) з'яўляліся каталікамі, 365 (33,2 працэнта) – іудзеямі, 328 (29,8 працэнта) – праваслаўнымі. А вось аналагічныя дадзеныя па Галоўчыну, колькасць насельнікаў якога за аналагічны адрэзак часу прыбавілася толькі на 65 асобаў і складала 956 чалавек: каталікоў налічвалася 15 чалавек, праваслаўных было 498, габрэяў – 443. Праўда, зноў жа, як і ў прыкладзе з Бялынічамі, яшчэ адна крыніца сведчыць: па стану на 1861 год у Галоўчыне пражывала 1402 чалавекі .

Калі палічыць інфармацыю аб колькасці жыхарства гэтых абодвух мястэчак па ўліку на 1861 год праўдзівай, то прырост насельніцтва ў іх будзе раўняцца адпаведна 1114 і 511 чалавекам. Але такія шпаркія тэмпы падаюцца зусім немагчымымі, малаверагоднымі.

Захаваліся звесткі аб тым, што ў гэты самы перыяд у Галоўчыне дзейнічаў габрэйскі малітоўны дом.

Роўна праз дзесяць гадоў

(Працяг на стар. 8)

БЯЛЫНІЦКАЕ ГАБРЭЙСТВА: АД ЧАСОЎ ПРАКАВЕТНЫХ ДАСЁННЯ

(Працяг. Пач. на стар. 7)

колькасць жыхароў Бялынічаў павялічваецца да 2559 чалавек, а габрэйскага насельніцтва ў працэнтных суадносінах крышачку паменела. Яго доля ў шматнацыянальнай людской супольнасці мястэчка адпавядала ўжо толькі 31,2 працэнта (мінус 2,0 працэнта).

Патлумачыць гэта можна шэрагам аб'ектыўных прычын, галоўнымі сярод якіх, думаецца, з'яўляюцца наступныя: уплыў Бялыніцкага кармеліцкага кляштару і касцёлу з іх паланізатарскай палітыкай; імклівыя тэмпы развіцця Галоўчына ды Эсьмон.

У 1870 годзе ў Галоўчыне пражывала 1041 жыхароў, з якіх амаль 46 працэнтаў былі габрэямі. А з 332 жыхароў Эсьмон больш за палову (54,2 працэнта) таксама складалі іудзеі.

У наступныя 27 гадоў назіраецца скарачэнне агульнай колькасці насельніцтва ў Бялынічах да 2215 чалавек. Поруч з гэтым статыстычныя дакументы зафіксавалі павелічэнне колькасці жыхароў Галоўчына (да 1254) і значнае – Эсьмонаў (538). Габрэйскую супольнасць у Галоўчыне складалі 433 чалавекі, у Эсьмонах – 214, у Бялынічах – 1063. Пачынаючы з 1860 года назіраем узвышэнне Бялынічаў і выдзяленне іх у дамінантны гандлёва-гаспадарніцкі, рэлігійны, найперш – каталіцкі, культурніцкі асяродак. Вызначала гэту тэндэнцыю галоўным чынам як павелічэнне агульнай колькасці жыхароў, так і дзейнасць іудзеяў у галіне эканомікі, а каталікоў – у сферы духоўнай.

Варта заўважыць, што цягам пройдзенага гістарычнага шляху менавіта ў Бялынічах паўстала найбольшая кансалідаванасць мясцовай грамадскай супольнасці, што станоўча садзейнічала ўзвышэнню і вылучэнню мястэчка, паступоваму развіццю яго ў значны эканамічна-культурніцкі цэнтр. Касцёл з царквою актуалізоўвалі і задавальнялі рэлігійна-культурніцкія, духоўныя патрэбы, а мясцовая габрэйская супольнасць найбольш спрычынілася да запачаткавання сістэмы мясцовага гаспадарніцтва і гандлю.

Неабходна засяродзіць увагу і на тым, што за 37 гадоў (1860–1897) колькасць габрэйскага насельніцтва ў Бялынічах павялічылася з 365 да 1063 – амаль у тры разы. У той жа час у Галоўчыне яно зменшылася на 10 асобаў (з 443 да 433).

Агульная колькасць жыхароў Бялынічаў за 112 гадоў павялічылася без малога ў паўтара раза (Галоўчына – у 1, 4), а за адзначаны 37-гадовы перыяд – крышачку больш, як у два разы (Галоўчына – у 1, 3).

Што ж да скарачэння агульнай колькасці насельніцтва Бялынічаў у перыяд з 1870 да 1897 гадоў, то, відаць, на гэта найперш паўплывалі знішчальныя пажары. Вядома, што за гэты час у мястэчку адбыліся два страшэнныя пажары: 27 ліпеня 1894 года, калі згарэлі 18 жылых двароў і 7 гандлёвых лавак, а ў полымі пажару 6 чэрвеня 1896 года ператварыліся ў чорны попел 106 местачковых пабудоў – выгарыла большая частка Бялынічаў!

У 1835 годзе ў Расіі выйшла "Палажэнне аб габрэях", якое вызначала арганізацыйныя формы іхняга рэлігійнага жыцця. Агульныя малітвы ім дазвалялася выконваць толькі ў спецыяльна прызначаных для гэтага збудаваннях: сінагогах ды малітоўных дамах. Загадвалася на кожныя 30 габрэйскіх сядзіб адкрываць адну малітоўную школу, а на 80 – сінагогу. Уводзіліся і шэраг іншых абмежаванняў. Напрыклад, равіны павінны былі выбірацца на сходах адзінаверцаў і зацвярджацца местачковым начальствам.



Новае палажэнне ўкаранялася з цяжкасцямі, аб чым сведчаць вынікі праверак, праведзеных у 1845 годзе. Асноўныя парушэнні зводзіліся да наступных: габрэйскія грамады ігнаравалі казённых равінаў, маліліся ў недазволеных месцах.

Дзеля таго, каб атрымаць вычарпальныя звесткі аб становішчы ў межах аселасці і мець магчымасць прыцягваць парушальнікаў "Палажэння аб габрэях" да адказнасці 27 студзеня 1853 года дырэктар Дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў Расеі В. Скрыпіцын накіроўвае ва ўсе губерні імперыі ліст з просьбай аб складанні па вызначанай ім форме спісу габрэйскіх малітоўных будынкаў ды іхніх пасадавых духоўных асобаў.

(Заканч. у наступным нумары)

М. Карпечанка, shtetle.co.i

Очередная конфискация в Шкловском районе

2 июня ГБЭП, ИМНС на улице в д. Черноручье установлен факт реализации ИП, могилевчанкой, 1966 г.р., 123 единиц одежды и постельного белья импортного производства. Продукция на общую сумму 8 150 000 руб. изъята, составлен административный протокол по ст. 12.17 ч. 4 КоАП.

Круглянский "боевик"

29 мая прокуратурой Круглянского района возбуждено уголовное дело по ст. 154 ч. 1 УК (Истязание) в отношении ранее судимого жителя д. Шепелевичи, 1973 г.р., который в период с 21 января по 10 мая в своем доме систематически избивал сожительницу, 1980 г.р. Раскрыто УИМ, сообщает uvd.mogilev.by.

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: 213173, Магілёўская вобл., Бялыніцкі р-н, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Падпісана ў друк 04.06.2014 г. у 09-00.